этой деятельности в соответствии со своими потребностями, чувствами и религиозным мировосприятием (Л.Н.Кривцун-Левшина, З.И.Макаревич, 2009). К основным блокам показателей религиозной активности личности относят: вовлеченность в религиозную деятельность, мотивационность, направленность, устойчивость, ритуальность, инициативность и творчество религиозных действий. В структуре этих показателей центральным звеном функциональности религии является направленность религиозной активности личности, основанной на нравственных позициях в системе отношений «человек-Бог- другой человек (социум)». Частными показателями оценки степени сформированности религиозной нравственности на наш взгляд являются проявление нравственных отношений личности как носителя религиозного сознания и ценностей, ориентация на настоящее и будущее нравственное поведение относительно своей семьи, религиозных сообществ, групп людей, нуждающихся в участии и поддержке.

Исследование показало, что из общего числа опрошенных студентов 63.9% идентифицируют себя с верой, из них – 81.2% - с православием. Основными мотивами их религиозной активности являются «надежда на помощь Бога, святых в жизненных ситуациях» (57.0%), «семейная религиозная традиция» (34.6%), «стремление приобрести душевный покой смысл жизни» (30.6%), «обязательность любого человека приобщения к вере» (28.9%). В тоже время ориентация на веру как способ «нравственного очищения, служения людям» характерно только для 11.8% респондентов. Преобладание личностно-ориентационных характеристик в религиозных отношениях студентов проявляется и в их нравственных ориентациях относительно других людей. Так, среди предлагаемых 25-ти позиций человеческих ценностей 32.1% определили значимыми в настоящее время «мир в обществе и стране», 18.8% - «веру в Бога», 17.4% - «чистую совесть», 7.4% - «полезность людям», 5.4% - « веру в людей», 1.5% - «принадлежность к своей нации»; в будущем – 2.2% - «меценатство и помощь людям», 2.5% - «служение Богу».

Таким образом, религиозная активность студенческой молодежи носит традиционный характер без акцентированной нравственно-религиозной мировоззренческой основы, являющейся сущностью истинной религиозности. Такое состояние идеологического основания религиозной активности студенческой молодежи требует мониторинговых научных исследований с последующим образовательным, культурологическим, религиозным осмыслением и системой практических действий по обращению молодежи к вере как нравственно-культурному базису развития и функционирования нации, государства, общества.

## ПОСТАЦЬ В. ЦЯПІНСКАГА Ў СТАНАЎЛЕННІ КНІГАДРУКАВАННЯ НА БЕЛАРУСІ

**Талецкая І.І.**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны»,*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Яшчанка А.Р., канд. гіст. навук, дацэнт*

Вялікае значэнне кнігадрукаванню і распаўсюджванню кніг сярод суайчыннікаў надаваў Васіль Мікалаевіч Амельяновіч-Цяпінскі. Мэта артыкула даследаванне укладу В. Цяпінскага ў станаўленне кнігадрукавання на Беларусі ў др. пал. XVI ст. Выкарыстаныя метады: гісторыка-тыпалагічны, апісальны.

Біяграфічныя звесткі аб Цяпінскім, надзвычай бедныя. Год нараджэння яго дакладна невядомы. Большасць даследчыкаў звязваюць нараджэнне Цяпінскага з 40-мі гадамі XVI ст. [1, С. 172].

В. Цяпінскі паходзіў з небагатай шляхецкая сям'і, якая жыла на Полаччыне ў маёнтку Цяпіна каля Лепеля. Ён меў жонку Сафію з заняпалага княскага роду Жыжэмскіх, трох сыноў, якіх звалі Абрам і Канстанцін: «старосты…воеводства Полоцкого пан Абрам і Константын Тяпиские, …от пани матки нашое пане й Зофеи, княжны Жыжэмское» [2, С. 16]. Але даследчыкі называюць і трэцяга сына Табіяша [3, С. 4]. У тых жа дакументах даецца і назва маёнтка жонкі Цяпінскага,  «найме Омельяновщыны»[2, С. 17].

Па некаторых дадзеных, Цяпінскі прымаў удзел у Лівонскай вайне [1, С. 172].

Але гаспадарчая дзейнасць не стала адзіным заняткам В. Цяпінскага. Не выключна магчымасць, што думка аб стварэнні друкарні ўзнікла ў Цяпінскага пад уплывам С. Буднага. Немалаважную ролю на гэты конт іграюць і звесткі аб удзеле Цяпінскагана сінодзе ў Лоску 1578г. С. Буднага і В. Цяпінскага звязвала асабістае знаёмства, але пытанне аб іх супрацоўніцтве дакладна не вызначана. На думку Г.Я. Галенчанкі, Нясвіжская друкарня была ўласнасцю самога Цяпінскага [1, С. 171-173].

Сведчаннем кніжнавыдавецкай дзейнасці В. Цяпінскага з'яўляецца яго «Евангелле». Вядомы экземпляр «Евангелля» няпоўны. Не вядомы ні месца выдання, ні год яго выхаду. У асноўным, даследчыкі зыходзяцца на 70-80-ых гг. XVI ст. як часе, калі Цяпінскі прыступіў да перакладу і друкавання на беларускай мове «Евангелля». Але давесці да канца распачатую справу яму перашкодзіла адсутнасць матэрыяльных сродкаў для такога мерапрыемства. Цяпінскі пераклаў і надрукаваў, па яго ўласнаму сведчанню, «писание святого Матфея и святого Марка и початок Луки» [4, С. 34]. Да гэтых трох няпоўных кніжак «Евангелля» ён напісаў прадмову, якая так і засталася ненадрукаванай. «Евангелле» Цяпінскі надрукаваў у выглядзе паліглоты, дадаўшы да свайго перакладу царкоўна-славянсікі тэкст, які быў змешчаны побач [5, С. 104]. У сваёй прадмове да «Евангелля», якая была адным з віднейшых помнікаў грамадскай думкі таго часу і крыніцай яго сацыяльна-палітычных і культурных погядаў, Цяпінскі выступае не толькі як рэлігійны прапаведнік, але і як грамадскі дзеяч сваёй эпохі. Тут ён выказвае свае грамадскія погляды на рад найбольш актуальных і хвалючых з'яў тагачаснай рэчаіснасці. Цяпінскі з гараччу канстатаваў, што яго краіна перажывае цяжкія іспыты. Прычыну гэтага Цяпінскі бачыў у праводзімай палітыцы апалячвання беларускага насельніцтва, у падтрымцы гэтай палітыкі мясцовымі феадаламі, якія ігнаравалі сваю гісторыю, родную мову і сталі пераймаць усё замежнае [4, С. 34]. Цяпінскі лічыў, што менавіта духавенства губляе грамадскія і маральныя сілы народа. Ён крытыкаваў яго: «митрополит, владыки и учителя … . Ова бы ку науце, леч не таком, яко тепер, не вѣчный свой встыд: толко прочести ито ледво в своем языку» [4, С. 36].

В. Цяпінскі як прыхільнік антытрынітарскага вучэння галоўную ўвагу звяртаў не столькі на рэлігійныя пытанні, колькі на пытанні культурна-выхаваўчага і адукацыйнага характару. Ён прадвызначаў свае выданні для адукацыйных і выхаваўчых мэт [4, С. 34].

В. Цяпінскі быў для свайго часу бадай што выключэннем з раду вядомых буйнейшых прадстаўнікоў пратэстанска-рэфармацыйнага руху ва ўмовах Беларусі. У практычнай дзейнасці друкара-асветніка на першы план вылучаліся не рэлігійныя, не вузкасаслоўныя і класавыя, а агульнанародныя інтарэсы яго радзімы. Ён адзін з першых рашуча і смела выступіў на барацьбу супраць паланізацыі роднага краю сваёй дзейнасцю.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Галенчанка, Г. Я. Васіль Цяпінскі – паслядоўнік скарынінскай справы // Г. Я. Галенчанка // 450 год беларускага кнігадрукавання. (зб. артыкулаў). - Мінск: Навука і тэхніка. - 1966. – С. 171-180.
2. Бабкова, В. Васіль Цяпінскі. Новыя дакументы / В. Бабкова // Спадчына. – 1991. - № 3. – С. 16-22.
3. Бабкова, В. Пра мяне (В. Цяпінскі) / В. Бабкова // Крыніца. – 1995. - № 4. – С. 3-7.
4. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны : зб. твораў / У. Г. Кароткі. - Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 309 с.
5. Клімаў, І. П. Васіль Цяпінскі і яго перакладное «Евангелле» / І. П. Клімаў // Весці АНБ (серыя гуманітарных навук). – 1997. - № 4. – С. 103-106.